УДК 476 (091)

# Арганізацыя палітычнага нагляду над Беларускай Сацыялістычнай грамадой у Расійскай імперыі

Бусько С.І.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Па меры ўзрастання арганізаванага працоўнага руху, ўзнікнення партый у Асобым Аддзеле Дэпартамента паліцыі актывізуецца праца па арганізацыі палітычнага вышуку ў гэтым накірунку.

Кожнае ахоўнае аддзяленне, а на тэрыторыі пяці беларускіх губерняў іх было тры – Віленскае (1902-1909 гг.), Беластоцкае (1906-1910 гг.), Паўночна-Заходняе раённае (1907-1914 гг.), павінна было два разы ў год рабіць справаздачу па ўсіх палітычных партыях і арганізацыях на кантралюемай тэрыторыі. Звычайна першая характарыстыка складалася з трох частак: праграма партыі, апісанне часу ўзнікнення і пачатку дзейнасці ў разглядаемай губерніі, сціслы аналіз мясцовых камітэтаў партыі. На падставе дадзеных справаздач штогод фарміраваўся «Обзор революционных партий с кратким изложением программ, тактики и организации их». У адрозненне ад РСДРП, БУНДу ці анархістаў Беларуская сацыялістычная Грамада не патрабавала абавязковага агляду і матэрыялы аб яе дзейнасці змяшчаліся не вельмі часта, звычайна паміж прыбалтыйскімі сацыял-дэмакратычнымі партыямі і ўкраінскай СПЛКай.

Неабходна адзначыць, што ў губернскіх жандарскіх упраўленнях (ГЖУ) успрымалі слова «белорусская» як тэрытарыяльны аспект. Спецыяльнай агентуры па БСГ у мясцовых упраўленнях не было да 1907-1908 гг. Асноўныя звесткі і ўвогуле матэрыял аб існаванні такой партыі трапляў у ГЖУ выпадкова, пры наглядзе за эсэрамі, анархістамі. Інфармацыя трапляла ў сталічную паліцыю з істотным спазненнем. Так, Маскоўскае ахоўнае аддзяленне вызначае колькасць членаў БСГ на верасень 1909 г. у 1-2 тысячы чалавек, у асноўным па Мінскай губерніі. Не маючы ў час рэвалюцыі дастатковых рэсурсаў, кіраўніцтва мясцовых жандармскіх упраўленняў выкарыстоўвала эфектыўную, але кароткатэрміновую тактыку: скіроўваючы філераў і агентуру на найбольш важныя антыўрадавыя гурткі эсэраў і анархістаў, для ўздзеяння на дробныя арганізацыі выкарыстоўвалі «топтунов», г. зн. філераў, асноўная мэта якіх – напалохаць рэвалюцыянераў, прымусіць іх змяніць месца жыхарства ці знішчыць лістоўкі і друкарскія прыналежнасці.

Беларускі нацыянальны рух (у асобе БСГ) не з'яўляўся важным аб'ектам для органаў палітычнай паліцыі Расійскай імперыі. Аднак кантроль над антыўрадавай дзейнасцю БСГ быў выдатна арганізаваны, асабліва з 1906-1907 гг.